Цана 15 гр. Przesyłka opłacona ryczałtem

БЕЛАРУСКІ ФРОНТ

ВЫХОДЗІЦЬ 1-га і 15-га КОЖНАГА МЕСЯЦА

РЭДАКЦЫЯ і АДМІНІСТРАЦЫЯ: Вільня, Вострабрамская вул. 1 — 20 (Wilno, ul. Ostrobramska 1 — 20). Адчынена ад 9 да 19 г.

Выпіска: на год — 2 зал., на паўг. — 1 зал., на 3 м-цы — 50 гр. Нумар конта паштовага разрахунку: 100

НЕЗАЛЕЖНЫ НАРОДНА-РАДЫКАЛЬНЫ ЧАСАПІС

№ 1 (35) — Вільня, 1 студня 1939 г. — Год IV

З НОВЫМ ГОДАМ, З НОВЫМ ШЧАСЬЦЕМ!

Усім нашым Чытачом, Прыхільнікам і Прыяцелям перасылаем найлепшыя Навагодня пажаданьні!

РЭДАКЦЫЯ і ВЫДАВЕЦТВА „БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ“.

НОВАГОДНІЯ РАЗВАЖАНЬНІ.

На пачатку кожнага году людзі заўсёды ставяць пытаньне: што нам прынясе новы год? Каб адказаць на гэтае пытаньне, адны займаюцца часта прароцтвамі або проста стараюцца „адгадаць“ будучыя падзеі; другія-ж падыходзяць да справы інакш: яны стараюцца *пазнаць дзеючыя міжнародныя сілы, дасьледзіць іх кірункі* і на падставе гэтых досьледаў *зрабіць адпаведныя высновы.* Гэтак зробім і мы.

Спаміж дзеючых у сьвеце сілаў на першым месцы бязумоўна трэба паставіць нацыянальную ідэю або г. зв. *нацыяналізм.* Гэту ідэю разумеюць розна: адны ўважаюць нацыяналізм за дынамічную сілу, свайго роду стыхію, якая дае народу ня толькі сведамасьць аб кроўнай і псыхічнай суцэльнасьці нацыі, але пануе волю адзінак да дзеяньня, да працы для дабра народу і наагул прабуджае ў народзе творчыя сілы (творчы нацыяналізм); другія разумеюць нацыяналізм як спосаб абароны свайго народу перад суседзямі (пасыўны або абаронны нацыяналізм); іншыя ўважаюць нацыяналізм за прыладу да пашырэньня ўплываў свайго народу на другія народы (імпэрыялістычны нацыяналізм). Ня будзем тут затрымлівацца над разнаякімі формамі і кірункамі нацыяналізму, а толькі сьцьвердзім аграмадны ўплыў яго на сучаснае палітычнае жыцьцё. Ня трэба хібаж гаварыць, што апошнія падзеі ў Сярэдняй Эўропе выплывалі якраз з нацыянальных ідэяў. Гэтыя ідэі пашыраюцца далей і захапляюць народы ня толькі ў Эўропе, але па ўсіх часьцінах сьвету. Словам, нацыяналізм зьяўляецца сяньня вялікай дынамічнай сілай, якая імкнецца да перабудовы палітычнага ладу.

Другой дынамічнай сілай, якая імкнулася і імкнецца да перабудовы сьвету, ёсьць *інтэрнацыяналізм.* Гэты кірунак людзі таксама разумеюць розна; ёсьць інтэрнацыяналізм камуністычны, соцыялістычны, хрысьціянскі і іншыя. Трэба прызнаць, што інтэрнацыянальныя ідэі панавалі да апошніх часоў, асабліва праз усё XIX стагодзьдзе і на пачатку XX-га аж да Вялікай вайны. Некаторыя тэорэтыкі інтэрнацыяналізму думалі, што ўзгадаванае на інтэрнацыянальных ідэях чалавецтва, асабліва пралетарыят, ваяваць паміж сабою ня будзе, але падасьць сабе рукі — і такім парадкам наступіць агульны мір і супакой. Аднак гэтыя думкі не апраўдаліся. Праўда, у часе Вялікай вайны былі спробы проціўваенных выступленьняў з радоў пралетарыяту (ў Францыі Жорэс, у Нямеччыне Лібкнэхт), але іх зьлквідавалі нацыяналізм. Ад гэтага часу нацыяналізм перайшоў у наступленьне і захапіў цэлы рад народаў, якія апынуліся без прастору або бяз волі. З гісторыі апошніх гадоў бачым, што нацыяналізм прыймаецца асабліва народамі паднявольнымі. Дзеля гэтай перамагаючай сілы нацыяналізму тэорэтыкі інтэрнацыянальных кірункаў пачалі паддаваць рэвізіі свае праграмы адносна нацыянальнага пытаньня і шукаць спосабаў пагаджэньня нацыяналізму з інтэрнацыяналізмам, але, як дагэтуль, без рэзультатаў. Ані ў Саветах, ані ў г. зв. дэмакратычных дзяржавах нацыянальнае пытаньне ня вырашана так,каб здаволіць „нацыянальныя меншасьці“. Дык нацыяналізм астаецца надалей дынамічнай і рэвалюцыйнай сілай, якая нясе сьвету палітычныя перамены.

Практычным высновам з нацыяналізму ёсьць *ідэя самаазначэньня народаў.* Гэта ідэя без нацыяналізму былаб немагчымай. Сфармуляваная ў часе Вялікай вайны нябожчыкам Вільсонам, ідэя самаазначэньня народаў уводзіцца цяпер у жыцьцё Гітлерам, што дало некаторым публіцыстам аказію назваць Вільсона Аллахам гэтай ідэі, а Гітлера яе прарокам. Аднак гэтае прыраўнаньне ня зусім правільнае. Трэба ведаць, што ідэя самаазначэньня народаў паўстала перад Вільсонам і Гітлерам, адначасна з нацыяналізмам. Абедзьве ідэі радзіліся з дэмакратычных ідэяў роўнасьці, волі і братэрства, кінутых у сьвет Вялікай францускай рэвалюцыяй. Дэмакратызм вясьціў роўнасьць, волю і братэрства людзям як адзінкам, а самаазначэньне вясьціць тоеж самае народам. Разам з ідэяй самаазначэньня народаў пачынаецца змаганьне паднявоExternal народаў за „роўнасьць волю і братэрства“! Аж дзіва бярэ, што за такія рэчы трэба змагацца! Болей скажам — змаганьне за роўнасьць і волю народаў можа быць вельмі крывавым і можа цягнуцца доўгі час!

На грунце змаганьня нацыянальных і інтэрнацыянальных ідэяў стварыліся сяньня два вялізарныя блёкі, якія рыхтуюцца да сьмяротнага бою. Каб дайсьці да перамогі, нацыяналісты арганізуюць свае нацыі, ўводзяць нацыянальны тоталізм, выкідаюць з народнага арганізму чужыя элемэнты (жыдоў), пашыраюць свае ўплывы на другія народы. Інтэрнацыяналісты з свайго боку арганізуюць інтэрнацыянальныя сілы: фінансавыя, людзкія і матар'яльныя. Калі наступіць паміж гэтымі блёкамі бой, мы гадаць ня будзем (гэтага мусіць ня ведаюць і самі арганізатары блёкаў), адно толькі пэўнае, што гэты бой некалі наступіць. Гэта будзе бой адзін з найбольшых у гісторыі...

Вось з гэтакімі ідэямі і з гэтакімі прадбачаньнямі ўходзім у новы 1939 год. **У ідэях нацыяналізму і самаазначэньня народаў крыецца глыбокі мотар сучаснага і будучага палітычнага жыцьця. Палітычныя падзеі, якія цяпер перажывае Эўропа, ёсьць толькі праявамі гэтых ідэяў.** У 1938 годзе гэтыя ідэі да вайны не давялі, хоць яна была ўжо вельмі блізка, дзяржаўныя мужы, баючыся вайны, пайшлі на ўступкі, аж да зьмены граніц уключна (чаго звычайна без вайны не бывае), а што нам прынясуць гэтыя ідэі ў 1939 годзе?

На гэтае пытаньне адкажа сам 1939 год.

—

Нямецкія пляны на Ўсходзе.

Дасьледваючы ўважна сяньняшнюю нямецкую палітыку, трэба прызнаць, што яна вызначаецца глыбока распрацаванаю пляновасьцю. Гэтую пляновасьць спасьцерагаем ва ўсіх кірунках: паўднёвым (Італія і Гішпанія), заходнім (Францыя і Англія) і ўсходнім (Балканы, Польшч, Літва, Саветы),

Мы ўжо пісалі ў адным з папярэдніх нумароў „Бел. Фронту“, што перад нямецкай палітыкай ляжаць два кірункі: адзін — **на мора,** г. зн. па калёніі, а другі — **на Усход** г. зв. „Drang nach Osten“. Мы тады казалі, што Нямеччына адначасна ў двух кірунках ня пойдзе, але выбярэ для сябе адзін кірунак. Калі выбярэ першы кірунак і пойдзе здабываць калёніі, яна будзе шукаць згоды на Усходзе; каліж выбярэ другі кірунак і пойдзе паводле плянаў Гітлера арганізаваць Усход, яна пашукае згоды на Захадзе. Змагацца на два фронты, так, як гэта было ў часе Вялікай вайны, Нямеччына цяпер ня будзе; за такое змаганьне Гітлер у сваей кнізе „Mein Kampf“ востра крытыкуе Вільгельма II. Паказчыкам, куды скіруецца Нямеччына, будзе... шуканьне ею згоды. Калі Нямеччына будзе шукаць згоды на Ўсходзе, гэта значыць, што кіруецца на Захад, каліж будзе шукаць згоды на Захадзе, гэта знак, што кіруецца на Усход...

Нямеччына цяпер шукае згоды на Захадзе, дык вывад з гэтага ясны. Праўда, Нямеччына часам успамінае і аб калёніях, але ў палітычных кругох пануе пракананьне, што гэта робіцца толькі з тактычных прычын. Сутнасьць гэтай тактыкі ў тым: Нямеччына заяўляе, што ёй патрэбны тэрыторыі дзеля эканамічнай і нацыянальнай экспансіі. Гэтым самым ставіць Англіі і Францыі такія жаданьні: або аддайце мне калёніі, або пазвольце ісьці на Усход. Аддаваць калёніяў ані Англія, ані Францыя ня хочуць (аб гэтым былі цьвёрдыя заявы англійскіх і францускіх дзяржаўных мужоў), значыць, прымушаны будуць згадзіцца на рэалізацыю ўсходніх нямецкіх плянаў.

Якія-ж гэта пляны?

Пляны новай нямецкай палітыкі былі сфармуляваны і прадстаўлены Гітлерам у першым выданьні ягонай праграмовай кніжкі „Mein Kampf“, выданай у 1927 годзе, калі яшчэ Гітлер здабываў уладу. У апошніх выданьнях, выйшаўшых у сьвет ужо ў той час, калі Гітлер быў пры ўладзе, гэтыя пляны прапушчаны. Зразумелая рэч, што Гітлер, як галава дзяржавы, ня можа пі-

саць таго, што пісаў, як павадыр партыі.

Пляны Гітлера на Усходзе прадстаўляюцца так: „Каб злучаная нацыянальна нямецкая дзяржава магла распачаць вялікую гістарычную кар'еру, патрэбны два вонкавыя варункі: першы — Нямеччына не павінна дапускаць, каб на захад і на ўсход ад яе існавалі вялікія, праводзячыя дзейную палітыку дзяржавы; другі — Нямеччына павінна здабыць для сябе абшары палітычнай, эканамічнай і нацыянальнай экспансіі ў Эўропе. Дзьве дзяржавы, якія могуць накінуць Нямеччыне цяжкую друхфрантовую вайну, гэта перадусім Францыя і Расея. Гэта апошняя знаходзіцца ў стане рэвалюцыйнага бурленьня. Адсоўваньне або недапусканьне да ўтварэньня на абшары сяньняшняга Савецкага Саюзу нейкага аднолітага і шчыльнага дзяржаўнага арганізму ляжыць у інтарэсе Нямеччыны. Апроч гэтага распад Савецкага Саюзу на паасобныя нацыянальныя дзяржавы (расейскую, украінскую, беларускую, грузінскую, армянскую, тюркмэнскую і інш.) а такжа апанаваньне ўсходня-сібірскіх пустыроў Японіяй, быліб ахвотна бачаны Нямеччынай. Бо з хвілінай гэтага распаду быўбы зьдзейсьнены ў такой ці іншай форме другі варунак узыходу Нямеччыны на вялікі гістарычны шлях: нямецкі народ здабыўбы на ўсходзе ня толькі поле дзеля палітычных уплыв ў і эканамічнай экспансіі, але і абшары дзеля новай калянізацыі“. Узялі мы гэтыя словы з „Gazety Polskiej“ (24. IX. 1937 г.).

З гэтых слоў павадыра Нямеччыны адно ясна: падзел Саветаў на паасобныя нацыянальныя дзяржавы, у тым ліку і беларускую, ляжыць у пажаданьнях і плянах Нямеччыны. Аб гэтым піша прэса ўсяго сьвету. На захадзе Эўропы, а нават у Амэрыцы, распаўсюджваюцца адумыслова распрацаваныя карты і кніжкі, у якіх паказаны новы палітычны парадак у Эўропе. На першым пляне стаіць Украіна, але за Украінай паказваюцца і контуры Беларусі — як кажа „Illust. Kurjer Codzienny“ (9. XI. 38).

Варшаўскі „Меч“ (25. XII. 38) піша, што перад Нямеччынай ляжаць два шляхі, якімі яна захоча правесьці свае пляны адносна Украіны: першы шлях — гэта шлях паступовасьці. Першым этапам на гэтым шляху былоб стварэньне незалежнай Украіны на тэрыторыі Прыкарпацкай Русі. Потым да гэтай маленькай дзяржавы быліб далучаны тэрыторыі з украінскім насельніцтвам, якія ўваходзяць у склад суседніх дзяржаваў, але не СССР. Такім парадкам, былаб створана ўжо большая Украінская дзяржава. У гэтай дзяржаве немцы зарганізаваліб украінскую армію, вывучыліб яе, заспасобіліб ва ўсе прылады і потым скіраваліб яе на Саветы, выступаючы толькі ў характары саюзьнікаў, на заваяваньне Кіева і ўсяе Сав. Украіны. Ясна кажа „Меч“, што гэты плян быўбы разьлічаны на многа гадоў.

Паводле другога пляну немцы, доўга ня думаючы, адразу пойдуць на Саветы рэалізаваць пляны Гітлера. У эўрапэйскай прэсе — кажа „Меч“, ужо нават прадказваюць тэрмін рэалізацыі „вялікага пляну“ Гітлера, іменна вясну сёлетняга году! Нават паказваюць месяц — люты! Нам здаецца, што ў лютым рэалізаваць „вялікія пляны“ Гітлера пры ўсходнім клімаце і стане дарог немагчыма. Аб гэтым ведае кожны. Паказваньне на люты (значыць, за два месяцы!), як на тэрмін рэалізацыі гэных плянаў, толькі сьведчыць аб нэрвовасьці эўропэйскай прэсы. На наш пагляд, у лютым магчымы толькі першыя крокі нямецкай дыпляматычнай акцыі ў гэтым кірунку (напр. Клайпэда ці нешта іншае), але не сама рэалізацыя гэтых плянаў.

Уканцы пытаньне: а як адносяцца да ўсходніх плянаў Нямеччыны Францыя і Англія? Як чуваць, тыя быццам здаволены, што Нямеччына кіруецца на ўсход — і здаволены з двух прычын: першая — што ад іх будзе адсунута пагроза вайны, а другая — што Нямеччына ўпутаецца ўва ўсходнія справы, страціць там сваю сілу — і перастане быць страшнаю для Захаду...

Гэтак прадстаўляюцца пляны Нямеччыны. Аб гэтых плянах піша і польская прэса. Напрыклад „Słowo“ (28. XII.) так кажа: „Да вялікіх вырашэньняў прыбліжае нас гісторыя па Мюнхэне, гэта значыць, па часіне, у каторай заходнія вялікадзяржавы далі Нямеччыне вольныя рукі ў сярэдняй і ўсходняй Эўропе“. Далей „Słowo“ пытаецца, як будуць немцы рэалізаваць свае пляны, з Польшчай ці супроць Польшчы? Калі супроць Польшчы, дык як? Ці праз Карпацкую Украіну, ці праз далучэньне Усходняй Малапольшчы (Галіччыны — рэд.)? У кожным прыпадку Гітлер укладае пляны крыжавога паходу проціў Расеі, яе расчляненьне — кажа „Słowo“.

На наш пагляд, расчляненьня або падзелу Расеі на паасобныя нацыянальныя дзяржавы баяцца няма чаго: гэта ёсьць натуральны працэс нашых часоў і ён не сяганьня дык заўтра стацца мусіць. Мы толькі баімся аднаго: пры гэтым падзеле беларусы могуць быць скрыўджаны. І то скрыўджаны нават тымі, ад якіх беларускі народ крыўды мог найменш спадзявацца.

А. В,

ЗАЦЕМКІ З ЖЫЦЬЦЯ.

Новыя пляны? Ведамы польскі дзяяч Сэв. Выслоух, у варш. „Politycе“ (25 XII) у артыкуле: „Зьвязаць грамадзяніна з дзяржавай“ прабуе падыйсьці да разьвязкі беларускае праблемы у Польшчы. Наўперад сьцьвярджае, што польскі ўрад ня мае ніякай праграмы ў бел. справе і што кожны „мясцовы дастойнік“ хоча праводзіць нац. палітыку на сваю ўласную руку, будучы праканаым, што ён „будуе Польшч“ на „сваей“ тэрыторыі. Сьцьвердзіўшы гэтыя ўсім ведамыя факты, п. Выслоух кажа, што патрэбна тут глыбейшае ўняцьце праблемы, патрэбна зьбіраньне матар'ялаў і ацэнкі сіл, магчымасьцяў і шляхоў, якімі павінна ісьці кансэквэнтная і вытрывалая дзяржаўная палітыка адносна беларусаў. Далей п. Выслоух прыходзіць да такога характэрнага вываду: „Незадоўга будзем прымушаны зьвярнуцца з просьбаю аб матар'ялы да нашых суседзяў з Захаду, каторыя ўжо ад даўжэйшага часу прысьвячаюць пільную ўвагу нацыянальным адносінам Польшчы, ня выключаючы зразумела і справы беларускай. Тымчасам у сьведамасьці мясцовых, а можа і ня толькі мясцовых кіраўнікоў нацыян. палітыкі на Усходніх землях, праблема беларуская быццам ня існуе. Папросту, сказалі сабе аднэй стройнай раніцы, што беларусы ў Польшчы ня існуюць, дык ня існуе і г. зв. „беларуская справа“. Дзеля таго што гэтае цьверджаньне не спаткалася з ніякім урадавым запярэчаньнем (даныя сьпісу насельніцтва наагул не бяруцца пад увагу), дык тэза аб неіснаваньні беларусаў у Польшчы ёсьць сяньня бязсумліўна найболей уплывовай і папулярнай“.

Сказаўшы гэтае, п. Выслоух пераходзіць да ацэны гістарычных, псыхолёгічных і эканамічных падстаў беларускае справы і сьцьвердзіўшы, што „беларуская праблема ў Польшчы выходзіць паза межы Польскае Дзяржавы“, кончыць свой артыкул пажаданьнем, каб польская палітыка ішла да пералому недаверу і здабыцьця даверу і сымпатыі ў шырокіх масах беларускага народу для польскай дзяржаўнай ідэі“. І на гэтым канец. П. Выслоух не падае ані воднага спосабу, якім польская палітыка мае здабываць гэты „давер і сымпатыі беларускага народу“! І пашто было пісаць гэты артыкул? Сьляпыя яго не пабачаць, глухія не пачуюць...

Нас пляны п. Выслоуха не здавальняюць, бо зварочваюць увагу толькі на гаспадарчыя інтарэсы бел. народу, мінаючы нацыянальныя. Мы ўважаем, што гэтыя інтарэсы неразлучны.

Беларушчацца асаднікі. „Kurjer Wil.“ (21. XII. 38) яшчэ раз закранае справу беларушчаньня асаднікаў і прызнае, што гэта важная праблема. Сілаю палажэньня польскі асаднік ці каляніст мусіць увайсьці ў зносіны з наваколным насельніцтвам, бо весьці заўсёднае змаганьне ці выказваць сваю непрыязьнь немагчыма. А суседзтва і сваяцтва робяць сваё, асабліва гэта апошняе. Выяўляецца, што 72 прац. асаднікаў або каляністаў ажанілася на месцы, бяручы сабе жанкі з беларускага асяродзьдзя, а толькі 28 прац. прывязло сабе з этн. Польшчы. Беларускія жанчыны, уходзячы ў сям'ю асадніка, ня кідаюць у штодзенным жыцьці сваей мовы і ужываюць яе ў зносінах ня толькі з дзяцьмі, але і з мужам, а польскай мовай карыстаюцца толькі „пры сьвяце“ або пры гасьцях. Мала памагае тое, што гэтыя жанкі каталічкі, бо на вёсцы як праваслаўны элемэнт так і каталіцкі гаворыць пабеларуску. Як сьцьвярджае „Kur. Wil.“, найменш 75 прац. сем'яў, у якіх жонка ёсьць тутэйшага паходжаньня, дзеці гавораць пабеларуску, ужываючы польскай мовы толькі перад чужымі ды перад сваім бацькам. Такім парадкам ужо другое асадніцкае пакаленьне губляе польшчыну. Факт гэты сумны, кажа „Kur. Wil.“, але цалком натуральны і з этнічнага боку зразумелы: невялікая горстка асаднікаў-палякоў мусіць расплыцца ў акружаючай яе шчыльнай беларускай масе. Але гэта яшчэ не азначае зьніканьня клясавых розьніц паміж асаднікамі і белар. насельніцтвам, кажа „Кур. В.“. Асаднік астаўся дагэтуль для мясцовага мужыка ўзурпатарам, чалавекам, які незаслужана (у пракананьні таго мужыка) і ўдадатку задарма атрымаў абрабляную спрадвякоў мясцовым насельніцтвам зямлю, зямлю, на каторай дагэтага ня ўмее гаспадарыць, каторую часам проста марнуе, а найчасьцей не выкарыстоўвае яе адпаведна. Асаднік, агулам бяручы, ня ёсьць для бел. мужыка прыкладам, за якім ён могбы ісьці. Як часта ягона гаспадарка выклікае ў мясцовага суседа характэрнае ўздыханьне: „Эх, каб я гэтукую зямельку меў! А ён што з яе зрабіў“? — Гэтакімі славамі канчае „Кур. Віл.“.

З гэтага ўсяго мы зробім два вывады: 1) сіла беларус. „ройстаў“, якія ўсосваюць у сябе чужыя элемэнты: 2) вялікае значэньне існаваньня беларускай каталіцкай масы. У ўкраінцаў, калі нехта прыняў каталіцтва ў лацінскім абрадзе, для нацыі прапаў, а ў нас, прыняўшы каталіцтва, ад беларушчыны ня ўцячэ, а нават спаткаецца там з духоўнай каталіцкай літаратурай... Уцячы ад беларушчыны

Як памагчы беларускім „Ройстам“.

У мінулым годзе ў цэлым радзе нумароў „Б. Фронту“ мы разважалі матар'яльную галіту беларускіх „Ройстаў“ і дасьледавалі яе прычыны і рэзультаты. **Рэзультаты** гэтыя, як мы ўжо пісалі ў „Бел. Фронце“ з дня 5. VIII. 38 г., вельмі сумныя, яны **выражаюцца ў фізычным і псыхічным заняпадзе нашага народу, а такжа ў яго грамадзкай і нацыянальнай пасыўнасьці.** З гэтакім палажэньнем беларусы згадзіцца ня могуць і заўсёды шукалі і шукаюць з яго выхаду. Пашукаем яго і мы.

Перад гэтым мусім адзначыць **важнасьць** такога „шуканьня“. Трэба ведаць, што ўжо само дрэннае палажэньне грамадзтва ці народу ёсьць прынукай да шуканьня выхаду з такога палажэньня. Шукаючы выхаду, людзі выдумліваюць розныя тэорыі, твораць пляны, пішуць праграмы і ўводзяць іх у жыцьцё. А ўсё гэта з тэй мэтай, каб памагчы бядзе. Некаторыя беларускія дзеячы думаюць, што з сучаснага палажэньня ўжо няма выхаду і затым у зьняверы і бязьдзейнасьці апускаюць рукі. Мы аднак не глядзім так пэсымістычна і не ўважаем палажэньня бел. народу за такое бязвыхаднае і безнадзейнае. У кожнай важнай справе трэба браць пад увагу ня толькі сучаснасьць, але і будучыню. Бяручы гэта пад увагу, мы падаём некаторыя спосабы палепшаньня матар'яльнага быту нашага народу.

Перш-на-перш ставім такую тэзу — цьверджаньне:

Галоўнай прычынай галіты нашай вёскі ўважаем нястачу ў яе свайго варштату працы. Каб кожны жыхар меў свой варштат працы, які даваўбы яму ўтрыманьне, галіта былаб меншая або нават яе мясцамі ня былоб зусім.

Варштатам працы можа быць: 1) зямля, 2) рамясло, 3) фабрычны промысел, 4) гандаль, 5) вольныя прафэсіі.

Зямля дае плады для пажывы чалавека (ежы) і ўсякі матар'ял (сыравіну) для вырабу прадметаў штодзеннага жыцьця.

Рамясло дае перапробку ўсякай сыравіны, з тым, каб яна была прыдатнай для чалавечага ўжытку.

Фабрычны промысел робіць гэтае самае, што і рамясло, толькі ў вялікім маштабе.

Гандаль мае на мэце абмен пладамі вытворчасьці зямельнай, рамесьніцкай, фабрычнай.

Вольныя прафэсіі: вучыцялі, духавенства, урадаўцы, адвакаты, дахтары, інжынеры і інш. працуюць у галіне духовай і фізычнай культуры.

Гэта ёсьць галоўныя варштаты працы і пры гэтых варштатах працы павінны знайсьці сабе заняцьце і пражыцьцё ўсе жыхары краю. Каліж яны не знаходзяць, гэта знак, што або няправільны падзел варштатаў працы, або замнога насельніцтва. У першым прыпадку патрэбна грунтоўная грамадзкая рэформа, а ў другім прыпадку — эміграцыя (аграніччэньне патомства ёсьць горшым выхадам).

Цяпер пяройдзем да паасобных пунктаў.

1) ЗЯМЛЯ.

Пішучы аб зямлі, наўперад мусім сьцьвердзіць, што яна ёсьць **галоўным варштатам працы для земляробскага беларускага** народу. Усе іншыя варштаты займаюць у сучасным беларускім палажэньні другараднае значэньне, чаго за нармальнае зьявішча палічыць ня можна, бо кожны народ павінен працаваць **пры ўсіх** варштатах працы. Да зямельнага варштату працы беларус прывык, зжыўся з ім спрадвякоў і, трэба прызнаць, што яго любіць. Прыгэтым хоча гаспадарыць сам, як поўнапраўны яго ўласьнік і лічыць калхозны спосаб гаспадараваньня за горшы. Працуючы спрадвякоў на зямельным варштаце, беларус да іншых варштатаў ня прывык, (асабліва да гандлю), ня мае прыгэтым патрэбнай практыкі, галоўна матар'яльных варункаў (грашовага капіталу) і дзеля гэтага ўзяцца да працы пры гандлярскім варштаце ня мае магчымасьці і спосабу. Але гэта яшчэ ня довад, што беларус да гандлю ці да працы на іншых варштатах няздольны. Наадварот, пастаўлены пры рамесь

На беларускім ґрунце

„БЕЛ. ФРОНТ“ ДВУТЫДНЁВІКАМ.

Выпускаем у сьвет першы нумар „Б. Фронту“, як двутыднёвага часапісу. Ад Новага Году будзе выходзіць 1-га і 15 кожнага месяца.

Кірунак нашага часапісу астанецца такі самы, які быў дагэтуль, гэта значыць: незалежніцкая, вольная ад чужых уплываў, беларуская палітычная лінія; абарона інтарэсаў беларускага народу і яго нацыянальных вартасьцяў; змаганьне за поўныя палітычныя, грамадзкія і культуральныя правы беларускага народу і пашыраньне ў народзе ідэі каапэратывізму пад клічам „усё супольнымі сіламі“. Гэтакім парадкам будзем ня толькі ўсьведамляць народ, але і палітычна яго ўзгадоўваць.

Спосаб рэдагаваньня будзе мець на мэце: салідные і ўсебаковае асьвятленьне сусьветных падзеяў агулам, і беларускіх у асабліваcьці. Дзеля гэтага будзем зьмяшчаць артыкулы на тэмы беларускія і міжнародныя, імкнучыся да таго, каб даць беларускаму грамадзянству зар'ентаваньне ў труднейшых праблемах палітычнага і грамадзкага жыцьця. Чытачы няхай пішуць да нас, ставячы пытаньні, выказваючы свае пагляды, а мы, паводле магчымасьці і цэнзурных варункаў, пастараемся выясьніць справу на бачынах нашай газэты. Наагул, усе ўвагі чытачоў для нас вельмі карысны.

Цана за газэту будзе такая самая, імённа, 2 зл. у год. Хочам, каб наша газэта абхапіла найшырэйшыя кругі бел. грамадзянства. Зварочваемся адначасна да ўсіх нашых Прыяцеляў і Сымпатыкаў з гарачай просьбай **паддзяржаць нас** у нашай працы сваімі месячнымі і гадавымі складкамі. За выпісваньне нашай газэты мы ня можам даць нагароды - прэміі, так як гэта робяць іншыя газэты, але спадзяёмся, што і бяз гэтага нашы чытачы паддзяржаць нас.

Два з палавінай гады таму пачалі мы выдаваць „Бел. Фронт“ каапэратыўнымі сіламі, як месячнік; цяпер гэтымі-ж каапэратыўнымі сіламі, складаючыся хто што можа, выдаём як двутыднёвік; будзем імкнуцца, каб па нейкім часе мы яго выдавалі супольнымі сіламі як тыднёвік!

ВЫСЯЛЕНЬНІ З ВІЛЬНІ.

Пару тыдняў таму ведамыя беларускія дзеячы: кс. Адам Станкевіч і інж. Адольф Клімовіч атрымалі загад Віленскага ваяводы выехаць з Вільні, якая ляжыць у пагранічнай паласе. Матывы высяленьня не паказаны. Тэрмін выезду, даны да 28. XII. 38. Просьба выселеных прадоўжыць тэрмін дзеля ліквідацыі асабістых спраў астаўлена без рэзультату. У назначаны тэрмін абодва дзеячы выехалі з Вільні: кс. А. Станкевіч у Слонім, куды назначаны духоўнымі ўладамі на капэляна пры кляштары „СС. Непакалянэк“, а інж. А. Клімовіч у Варшаву, дзе будзе шукаць для сябе працы.

Разам з імі ў гэтым-жа тэрміне выселены яшчэ шырока ведамы у віл. і пазавіленскім грамадзянстве кс. Уладыслаў Талочка. Матывы высяленьня таксама не паказаны. У прэсавым паведамленьні кс. Ул. Талочка быў залічаны да беларускіх дзеячоў. Аднак ужо на другі дзень польская віл. прэса («Kur Wil») адзначыла, што залічэньне кс. У. Т. да беларускіх дзеячоў беспадстаўна, бо кс. У. Т. ня прымаў ніякага ўдзелу у палітычным жыцьці наагул і ў беларускім у асобнасьці, дык паводле «Kur. Wil.» прычыны высяленьня кс. У. Т. няясныя. Другая польская газэта «Słowo» зьмясьціла салідную абарону кс. У. Т., аднак без рэзультату. Кс. У. Талочка выехаў у Беласток.

Усім выселеным беларускае грамадзянства бяз розьніцы палітычных пракананьняў выразіла свой спогад.

З БЕЛАРУСКАЕ ПРЭСЫ

Ад гэтага нумару ўводзім агляд беларускай прэсы. У аглядзе будзем затрымлівацца над тымі артыкуламі бел. прэсы, якія варты ўвагі або якія закранаюць важныя праблемы сяньняшняга беларускага жыцьця. Робячы агляд, будзем паддаваць рачовай дыскусіі тыя артыкулы, з якімі не згаджаемся.

„Шлях Моладзі“. (8. XII. 38.) закрануў вельмі актуальную справу пашырэньня беларускай прэсы і прапануе сарганізаваць ад 15. XII. 38. да 15. I. 39. месяц беларускай прэсы. Думка вельмі добрая і мы да яе далучаемся цалком, толькі чаму ад палавіны да палавіны месяца, а ня цэлы месяц, напр. студзень? Ці ня лепш былоб, арганізуючы такія імпрэзы, паразумецца з іншымі бел. рэдакцыямі? Але гэта ня важна. Важна тое, што так ці інакш, але ёсьць месяц беларускай прэсы. „Мэтай гэтага месяца, кажа „Ш. М.“ ёсьць абзнаямляць як найшырэйшыя масы беларускага народу з беларускімі часапісамі, захвочваць да іх выпісваньня, купляньня, пашыраньня і чытаньня, бо толькі свае беларускія газэты і часапісы найлепш бароняць і найлепш дбаюць аб дабры беларускага народу“. Гэта тымболей трэба рабіць, бо чужыя газэты, якія беларусы купляюць і чытаюць, ня толькі не бароняць інтарэсаў беларускага народу, але аб ім нават не ўспамінаюць. А цяпер ідуць такія часы, што беларускага народу абмінуць трудна будзе.

„Хр. Думка“ (10. XII. 38.) у артыкуле „Нямецкія імкненьні і Беларусы“ займаецца актуальнай цяпер справай пашырэньня нямецкіх імкненьняў на Усход. Гэтыя імкненьні абыймаюць, як чуваць, ня толькі Ўкраіну, але і Беларусь. „Хр. Д.“ прыгэтым піша: „Нямеччына спадзяецца, што калі б паўстала Украіна і Беларусь, дык яна лягчэй дабралася б да ўкраінскага збожа і беларускіх лясоў“. Далей „Хр. Д.“ піша так: „Гэта аднак ня значыць, што Беларусы павінны ўжо цяпер баяцца нямецкіх плянаў і ўжо цяпер з імі змагацца“. У гэтых сказах „Хр. Думкі“ мы бачым не толькі няяснасьць, але і супярэчнасьць. А супярэчнасьці ў палітычнай лініі быць ня можа. Можна заняць крытычнае, пазытыўнае або нэгатыўнае становішча да пэўных фактаў або падзеяў, але супярэчнага ніколі!

„Беларускі Летапіс“ (сьнежань) выданы ў павялічаным разьмеры з студэнцкім дадаткам „Новая Зьмена“. Часапіс, агулам беручы, рэдагуецца добра, гэты нумар вельмі багаты, хоць з нейкім „нахілам“ да злоснай сатыры. Паміж іншым дасталося яшчэ і аўтару адкрыцьця году нарадзін Шота Руставэлі. І ня сьнілася Шоце Руставэлі, што ён, дзякуючы прыпадку, станецца слаўным на віл. беларускім ґрунце! Можа ляжачага ўжо Шутовіча біць і ня варта было-б!

„25 Сакавіка“ (сьнежань) — орган бел. хрысьціянскага студэнцтва. Ідэалёгічна-тэорэтычная часьць добрая, але палітычна-практычная зусім не ўдалася. У часапісе спасьцерагаецца наіўны падыход да палітычных спраў. Наагул часапіс робіць уражаньне, што ня можа знайсьці адпаведнага кірунку.

ЗАБАРАНЯЛІ ПРАДАВАЦЬ БЕЛАРУСКІЯ КАЛЕНДАРЫ.

Даведваемся, што на абшары ўсяго Маладэчанскага павету паліцыя забараняла прадаваць беларускія календары. Прадаўцы масава пачалі адсылаць бел. календары назад у бел. кнігарні ў Вільню. У мінулым тыдні дэлегацыя ад бел. кнігарняў была ў Віленскім ваяводзтве з інтэрвэнцыяй у гэтай справе. Начальнік Ваяводзкага Палітычна-грамадзкага Аддзелу абяцаўся зараз-жа выдаць загад, каб паліцыйныя ўлады на правінцыі не рабілі ніякіх перашкод у прадажы бел. календароў, якія былі прапушчаны віленскай цэнзурай. Дык беларусы ўсюды павінны жадаць сваіх календароў!

З САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

У сувязі з нямецкімі ўсходнімі плянамі пачалася ў БССР гарачая проціўнямецкая агітацыя, праводжаная радыем і прэсай. Агітацыя мае характар „патрыятычны“: пералічваюцца тыя „дабрадзействы“, якія беларускі народ атрымаў пры дапамозе „вялікага расейскага народу“, асабліва ад тав. Сталіна і падчырківаецца, што беларускі народ павінен быць удзячны за гэтыя „дабрадзействы“. Пасьля ўсяго, што камуністы зрабілі з беларусамі, цынізм гэтай прапаганды відавочны, але ён выступае яшчэ

каталік можа толькі тады, калі ўцячэ з бел. асяродзьдзя, але тады часта губляе беларушчыну нават беларус праваслаўны.

Няяснасьці. „Kur. Wil.“ (28. XII. 38) у даўгім артыкуле (пяра Ст. Сьвяневіча) выступіў у абароне кс. Ул. Талочкі, выселенага з Вільні. Між іншым у артыкуле пішацца так: „Калі паміж палітычнымі паглядамі рэпрэзэнтантаў улады і паглядамі такога сьвятара (карлапа), існуе сапраўдная ці ўмоўная розьніца, калі ён у адносінах да непалякоў паслугуецца мовай няпольскай — дык усёж-такі лепш, каб ён існаваў, каб трываў, каб прабуджаў развой духовага жыцьця пасярод веручых, чымся каб на яго месца мела стварыцца пустка, або ўваншоў ксёндз „дыспозыцыйны“, каторага словы будуць мёртвымі, каторы прыкладам свайго жыцьця ня будзе пацягваць, але адпіхаць ад касьцела“. Далей тлумачыцца, які гэта ксёндз „дыспозыцыйны“. Гэта такі, які дастасоўваецца да таких ці іншых намярэньняў ці палітычных мэтаў сьвецкіх дзейнікаў... кажа „Кур. Віл.“.

Цікава яшчэ, што ў тым артыкуле п. Ст. Сьв. залічыў кс. Глякоўскага да „польскіх моцарствоўцаў“ і паставіў за прыклад іншым, а гэта дзеля таго, што кс. Гл. пашырае ў часапісе „Logos“ Ягайлаўскую ідэю (idee jagiellońską). Мы ведаем, што кс. Гл. шмат пісаў на тэму Ягайлаўскай ідэі і дзеля нейкіх мэт выцягвае з архіву гэту даўно аджыўшую тэорыю, але знаем яго таксама, як выдаўца беларускіх „Пралесак“. Пытаньне, як можа пагадзіць кс. Глякоўскі выдаваньне беларускага часапісу з „mocarstwowością polską“? Можаб кс. Гл. гэту справу выясьніў! Добра былоб наагул выясьніць ідэалёгію беларусаў, „польскіх моцарствоўцаў“, калі такія існуюць!

ніцкім варштаце або фабрычным, беларус выказвае вялікія здольнасьці. Гэтае самае можна сказаць і аб вольных прафэсіях, толькі, нажаль, гэтыя варштаты для яго зачынены...

Дык зямля была заўсёды для беларуса галоўным і першым варштатам працы. Гэты варштат дае беларускаму народу сродкі да жыцьця і захоўвае яго існаваньне.

Прывязаннасьць беларуса да зямлі мае такжа вялікае нацыянальнае значэньне, бо бароніць яго ад асыміляцыі, перахоўвае нацыянальныя вартасьці і прычыняецца да разьвіцьця патрыятызму. Беларус любіць сваю Бацькаўшчыну і гэтая любоў дае яму сілу ператрываць усякія нягоды. Апроч гэтага яна яму памагае захаваць сваю нацыянальнасьць. Ня было яшчэ выпадку ў гісторыі, каб народ, прывязаны да сваей зямлі, загубіў сваю нацыянальнасьць. Ён яе згубіць тады, калі зрухнецца з месца і пойдзе ў сьвет... Дзеля гэтага губіць часта сваю нацыянальнасьць у сьвеце рамесьнік, рабочы, гандляр, але ня губіць яе земляроб-селянін, які сядзіць на месцы.

З гэтай прычыны ўважаем нашае сялянства за фундамант беларускай нацыі, падставай яе жыцьця і жаралом будучай рамесьніцкай, работніцкай, гандлярскай і інтэлігенцкай клясы. **Дык гэтаму сялянству трэба даць варштат працы, трэба даць зямлі.**

Але кажуць, што зямлі ўжо мала і яе ня хваціць **для ўсіх**. У гэтых словах шмат праўды — і дзеля гэтага якраз і патрэбны іншыя варштаты працы, якія маглі б абясьпечыць існаваньне тым, што ня знойдуць працы на зямлі. Але паміма ўсякіх даных аб малой колькасьці зямлі, мы можам сьцьвердзіць, што пры рацыянальнай зямельнай рэформе, праведзенай згодна з інтарэсамі **беларускага** народу, зямлі для жадаючых працаваць на ёй хваціць. Ёсьць яшчэ многа зямлі дворнай, казённай і іншай, якою можна былоб заспакоіць зямельны голад, або інакш кажучы, нястачу зямельных варштатаў працы. Праўда, на некаторых землях ужо сядзіць каляніст або асаднік, але паміма гэтага ёсьць яшчэ многа зямлі, якую можна было-б распарцэляваць паміж безьзямельных і малазямельных сялян.

На якіх-жа асновах трэба правесьці зямельную рэформу?

Першая аснова: надзяліць безьзямельных, а прырэзаць малазямельным столькі зямлі, каб яны маглі з гэтага варштату працы здабыць для сябе патрэбныя да жыцьця сродкі.

Другая аснова: найвялікшай гаспадаркай можа быць толькі гэтакая, якая можа быць апраблена гаспадарскай сям'ёй бяз наймітаў. Найміты дапускаюцца толькі ў выпадку хваробы, няшчасьця ці якіх іншых непрадбачаных выпадкаў. Апроч гэтага мусім адзначыць, што мы, стоячы на ґрунце каапэратывізму, дапускаем магчымасьць каапэратыўнага ўладаньня і апрабляньня зямлі, там, дзе народ гэтага захоча.

Трэцяя аснова: надзяленьне або прырэзка зямлі павінна адбыцца бяз выкупу. Дзяржава палагоджвае ўсе труднасьці, калі-б такія аказаліся, у сувязі з надзяленьнем бяз выкупу.

Гэтак, на наш пагляд, павінна быць вырашана зямельная праблема. Пры такім вырашэньні вялікая часьць нашага безьзямельнага і малазямельнага сялянства атрымалаб у форме зямельнай гаспадаркі свой варштат працы. Разам з гэтым трэба былоб наладзіць па вёсках спэцыяльныя агранамічныя курсы, знаёмячы сялянства з навуковымі спосабамі падняцьця ўраджайнасьці глебы, а для моладзі закладаць спэцыяльныя агранамічныя школы. Пры большай асьвеце і вышэйшай земляробскай культуры (аб чым павінна дбаць дзяржава), сялянскія гаспадаркі даваліб штораз болей даходу, што пазволілаб ня толькі пракарміць сям'ю, але прадаць лішку ў горад або заграніцу.

Але ясна, што ня ўсе сяляне атрымаліб зямельныя надзелы. Раз — што не хвацілаб зямлі, а другое — ня ўсе маюць ахвоту і здольнасьць працаваць на зямлі. Нацыя павінна абняць ня толькі зямлю але і ўсе іншыя галіны працы, як рамясло, фабрычны промысел, гандаль і вольныя прафэсіі.

Аб гэтых варштатах працы ў наступным нумары.

В. Г.

выразьней у розных заявах савецкіх палітыкаў. Гэтак маскоўскі карэспандэнт францускай газэты „Тан“ піша, што адказныя кіраўнікі сав. палітыкі яму заявілі, што ў Сав. Беларусі і ў Сав. Украіне сэпаратыстычныя імкненьні - немагчымы з тэй простай прычыны, што ГПУ іх вынішчыла. Дзеля гэтага Нямеччына ня знойдзе апірышча для сваіх плянаў ані ў Сав. Беларусі, ані ў Сав. Украіне. З гэтага відаць, што сав. улада праканана, што зьліквідавала на Беларусі ўсё беларускае.

Тымчасам да нас даходзяць весьці, што пад уплывам праціўнямецкай агітацыі, якую праводзіць сав. радыё і сав. прэса, рэзультаты атрымоўваюцца проста адваротныя, іменна, у народзе пашырана праканаНьне, што Гітлер мае прыйсьці, ці нават ужо ідзе, будаваць Беларусь... Рэзультаты агітацыі сапраўды нечаканыя! I гэтае пракананьне пашырана ўсюды, дзе чуваць сав. радыё!

БЕЛАРУСЫ НА ЧУЖЫНЕ.

З **Францыі** паведамляюць нас, што там „на беларускую акцыю ўведзены нацыянальны падатак. Пасты, сухія дні — ашчаднасьці ідуць на працу. Здольнасьці „шапіраграфу“, на каторым друкуюць тутэйшыя эмігранты сваю прэсу, даходзяць да пяці тысяч экзэмпляраў. Гэта ёсьць так званы „ратата р“ навейшае сыстэмы, куплены на выплату. Залажылася Беларуская Жаночая Грамада імені Алёізы Пашкевічанкі (Цёткі). Дня 11. XII. 38 зладзілі **першую беларускую вечарыну ў Парыжы.** Прайшла ўдала. Выступалі дэлегаткі ад украінак і дэлегат ад Хаўрусу Бел. Работнікаў у Францыі. У прагграме былі два даклады: аб Цётцы і аб заданьнях беларусак-эмігрантак на чужыне. Жанчыны выдадуць незадоўга свой жаночы бюлетэнь. Носяцца такжа з думкаю залажыць чэцьвяргову беларускую школу. Выступы дзяцей выклікалі найбольшае захапленьне на вечарыне. Пяялі і танцавалі „Лявоніху“. Аб вечарыне будзе падробна ў „Рэсе“. („Рэха“ — орган беларусаў у Францыі — рэд.). Прыступаем да выдаваньня інфармацыйнага бюлетэня ў францускай мове для загранічнай прэсы, якую будзем абслужываць у найшырэйшым маштабе, не агранічваючыся францускімі межамі“ — гэтак пішуць з Францыі.

Трэба прызнаць, што беларусы ў Францыі працуюць шчыра і могуць быць прыкладам для іншых.

З **Канады** нам пішуць, што беларусаў там многа, у некаторых местах іх налічваюцца тысячы. Але значная іх часьціна зарганізавана ў РРФК (Русские Рабоче-Фермерские Клубы) разам з расейцамі. У Канадзе „Клубы“ налічваюць больш 2,000 чалавек і трэба дапусьціць,што блізу палавіна — беларусы. Нядаўна ў Вінніпэгу адбыўся 8-мы Зьезд РРФК, прыгэтым амаль палавіна дэлегатаў на Зьездзе былі беларусы. У „Клубах“ русыфікацыя не праводзіцца, бо ёсьць гурткі і некаторыя „Клубы“, якія ужываюць беларускае мовы. Можна было-б павесьці работу, толькі няма адпаведных дзеячоў і літаратуры. У рэзалюцыях Зьезду РРФК многа гаворыцца аб палажэньні беларускага народу ў граніцах Польшчы.

На ўсё гэта адказваем, што праца пад чужым арганізацыйным сьцягам для беларусаў некарысна, трэба беларусам у гэтых важкіх часох выступаць пад сваім нацыянальным сьцягам. Стварэньне сваей уласнай беларускай арганізацыі ёсьць найпершым абавязкам канадзкіх беларусаў.

У Чехаславаччыне чэская газэта „Poledni List“ (8.XII.38) зьмясьціла вельмі прыхільны артыкул аб беларускай справе. Відаць, гэта заслуга „чэскіх“ беларусаў. На наш пагляд, „чэскія“ беларусы маглі-б праводзіць большую дзейнасьць.

Атрымалі весткі і з **Літвы,** але дзеля нястачы месца адкладаем іх да наступнага нумару.

На міжнародным грунце

АГУЛЬНЫ АГЛЯД.

Мінулы 1938 год быў годам важных падзеяў. Месяц верасень амаль ня прынес эўрапэйскае, а можа і сусьветнае вайны. Назначаны нават быў ужо і тэрмін нямецкай мабілізацыі і пачатку вайны: 28 верасьня 14 гадзіна... Ўратаваў сытуацыю Чэмбэрлен, які паміма сваіх 70-ці гадоў паляцеў на аэрапляне да Гітлера, хоць дагэтуль ніколі ня лётаў. У рэзультаце ягоных „лётаў“ была падзелена Чэхаславаччына і коштам гэтай дзяржавы ўратаваны мір... Хоць, праўду кажучы, аб міры цяпер гаварыць і ня можна, бо на двух канцох сьвету ідзе сапраўдная вайна: у Гішпаніі і Кітаі. Там ужо адбываецца змаганьне паміж двама блёкамі. Праўда, гэтае змаганьне мае характар болей пачатковы і, сказалі-б, стратэгічны: кожны праціўнік прыгатаўляе для сябе базы да будучай агульнай баталіі, але легкаважыць гэтага змаганьня ня можна. Трэба сказаць адкрыта: ад перамогі гэн. Франко ў Гішпаніі і японцаў ў Кітаі залежыць перамога г. зв. фашыстоўскага блёку ў будучым сусьветным бою. Бяз Гішпаніі і Кітаю палажэньне фашыст. блёку было-б вельмі цяжкое і яго па некалькіх гадох страшэннай вайны, у якую быліб уцягнуты сілы ўсяго сьвету, здушыўбы г. зв. дэмакратычны блек. Але пры актыўным выступленьні па старане фашыст. блеку Гішпаніі і Кітаю, палажэньне мяняецца,

У 1938 г. узрасла ў вялікую сілу Нямеччына. Пасьля далучэньня Аўстрыі і Судэтаў яна пры сваей тэхніцы стала рашаючым дзейнікам у Эўропе і плянуе на супалку з Японіяй і Італіяй рэформу ўсяго сьвету. Год 1939 будзе, здаецца, сьведкай гэтых рэформаў у шырэйшым маштабе.

Які-ж гэта мотар мабілізуе проціў сябе такія сілы? Адказ на гэтае пытаньне будзе такі: **найглыбейшым мотарам сяньняшніх падзеяў ёсьць дрэнны падзел зямлі.** Фашыстоўскія дзяржавы чуюцца пакрыўджанымі сяньняшнім падзелам нашай плянэты і гатовяцца ісьці ў бой за новы перадзел... А за зямлю бой заўсёды бывае крывавы, тымболей што дзяржавы, якія захапілі для сябе большую часьць зямлі (Англія і Францыя) на ўступкі ня ідуць. Ці ў гэтым 1939 годзе наступіць гэты рашучы бой, згадаць трудна. Здаецца, што будзе адбывацца яшчэ толькі **падгатова** да гэтага бою, так як ад пару гадоў адбывалася такая-ж падгатова ў Гішпаніі і Кітаю. Паводле праканаНьня палітычных кругоў, гэтая бліжэйшая падгатова мае выразіцца ў ліквідацыі Саветаў і стварэньні на абшары б. Расеі новых дзяржаў: Украіны, Беларусі і іншых. Ці пры гэтым не наступяць якія камплікацыі — прадбачыць трудна.

У мінулым сьнежні паўстаў востры канфлікт паміж Англіяй і Францыяй. Гэты канфлікт ёсьць адным з этапаў у падгатове да рашучага бою двух блёкаў і мае на мэце пашырэньне італьянскага панаваньня ў Афрыцы. Як відаць, фашыст. блёк падзяліў паміж сабою зямлю гэтак: Італія бярэ пад свае ўплывы паўночную і ўсходнюю Афрыку, Нямеччына — усходнюю Эўропу, а Японія — Азію. Усходні кірунак Нямеччыны выклікаў ў некаторых дзяржавах вялікую трывогу і прывёў да зьмены ўкладу палітычных сіл на Усходзе Эўропы. Дыпляматычная ігра гэтых сіл пачалася ў лістападзе, цягнулася праз увесь сьнежань і будзе адбывацца ў студні. Прадказаныя візыты мін. Бэка ў Парыжы; Літвінава (?), Рыбэнтропа (?) і Чіано ў Варшаве, Чэмбэрлена ў Рыме — сьведчаць аб тым, што ў дыплямат. кругох ня сьпяць... Дый урэшце цяпер ніхто не павінен спаць, бо на сьвеце адбываюцца важныя падзеі!

УСХОДНЯ-ЭЎРАПЭЙСКІЯ СПРАВЫ.

Нас найбольш цікавяць справы Ўсх. Эўропы, г. зн. становішча Польшчы, Літвы, Саветаў, Румыніі, і г. д.

Кірунак **Польшчы** вельмі добра прадставіла варшаўск. „Polityka“ (10.XII.38), якая так піша: „калі не здабудзем супольнай граніцы з Вугрыяй, зварот Польшчы да праціўнямецкага лагеру ў Эўропе будзе неадмоўнай канечнасьцяй. Ня толькі дзеля таго, што гэта будзе адзінай абаронай нашых паўдзённых камунікацыяў, але і дзеля таго, што гэта будзе асьцерагаючы знак, што Нямеччына не намерана і ў другой вялікай прабледе г. зн. у справе ўладжаньня палажэньня ў будучай Расеі, лічыцца з інтарэсамі Польшчы“. Другая польская газэта, віл. „Słowo“ (28.XII.38) паддае вострай крытыцы дагэтуляшнюю польскую палітыку і кажа, што польскі ўрад не супраціўляўся далучэньню да Нямеччыны Аўстрыі, наадварот, гэтаму далучэньню памог; не супраціўіўся разбору Чэхасл., наадварот, прыняў у ім удзел, гэтым памог Нямеччыне апанаваць сярэднюю Эўропу і выціснуць адгэтуль уплывы францускай палітыкі, давесьці да банкроцтва прэстіж Францыі... Далей „Słowo“ кажа, што трэба было або ісьці разам з Нямеччынай на Расею, а калі не, дык бараніць з усіх сіл францускіх пазыцыяў у Эўропе. Польшч не зрабіла ані аднаго, ані другога і дзеля гэтага апынулася цяпер у трудным палажэньні...

Паводле апошніх вестак мін. Бэк едзе ў Францыю. Мэта ясная: навязаць бліжэйшую лучнасьць з францускай палітыкай. Ці яму гэта ўдасца — даведаемся ў хуткім часе.

Літва перажывае вялікія труднасьці, вонкавыя і нутраныя. Звонку ідзе штораз мацнейшы націск Ням. на Клайпэду, датаго, што Літва прымушана была вывесьці адтуль сваю дзяржаўную паліцыю, асталася там толькі аўтаномная, клайпэдзкая. Гэта знак, што скора Клайпэда абвесьціць і нямецкую сувэрэннасьць. Літва, паводле заявы прэз. Смэтоны, павінна весьці рэальную палітыку, як адносна Нямеччыны, так і адносна Польшчы. Кажуць, што палітычны рэалізм давядзе уканцы Літву да ўключэньня яе ў нямецк.-палітычную сыстэму. Іншага выхаду ня будзе. Труднасьці Літвы павялічваюцца яшчэ і тым, што праціўнік прэз. Смэтоны, Вальдэмарас, які быў нядаўна выпушчаны з турмы, прабывае цяпер у Бэрліне, адкуль пашырае свае ўплывы і на Літву... Дзеля гэтага ў сьнежні адбыліся ў Літве арышты прыхільнікаў Вальдемараса.

Саветы адчуваюць націск з двух бакоў: з боку Нямеччыны і з боку Японіі. Аб націску з боку Нямеччыны мы ведаем, а з боку Японіі ідзе сварка за права лоўлі рыбы пры сібірскіх берагох — і адначасна ідуць чуткі аб далейшай канцэнтрацыі войска і аб новых украпленьнях на манджурскай граніцы, як з боку японскага, так і савецкага... Паразумленьню з Польшчай Саветы не прыдаюць вялікага значэньня і пасьля адказу памагаць Літве і Чэхаславаччыне, сумліўным ёсьць, ці Саветы будуць умешвацца ў нейкія эўрапэйскія канфлікты.

Румынія здэцыдавана здушыла ворагаў свайго караля. Пасьля сьмерці Кодрэану былі там яшчэ падобныя факты растрэлаў, так што нават брат забітага Кодрэану далучыўся да рум. урадавай партыі! Аказваецца, што змаганьне ў Румыніі мела болей асабісты характар, чым прынцыповы: гэта было змаганьне рум. караля з сваімі праціўнікамі. Цяпер ужо рум. кароль у сваей дзяржаве яўных праціўнікаў ня мае, ён кіруе ўсім. Ягоная палітыка ідзе ў кірунку прыязьні з Нямеччынай а прынамся яе недражненьня. Палажэньне Румыніі, як нутраное так і вонкавае, можна збольшага прыраўнаваць да палажэньня Літвы.

Карпацкая Ўкраіна сталася цэнтральным пунктам эўрапэйскай дыплямацыі. І каго там няма? І нямецкія дыпляматы, і румынскія, і італьянскія і нават японскія! Японскі дыплямат быццам заявіў карпацкім украінцам, што „хоць ваша дзяржава і малая, але мае перад сабою вялікую будучыню“. Характэрная рэч, што француская вайсковая місія, якая дагэтуль прабывала ў Чэхаславаччыне, выехала. На яе месца мае прыехаць нямецкая...

У Нямеччыне ад 1.XII.38, як падае львоўская ўкр. прэса, утварыўся Камісарыят для Украінскіх спраў. Камісарыят мае на мэце рээстраваць прабываючых у Нямеччыне безьдзяржаўных украінцаў, вырабляць для іх пашпарты, дазволы на жыхарства, шукаць працу, даваць парады і г. д.

Ад 1.I.1939 г. меў утварыцца падобны Камісарыят для Беларускіх спраў, з падобнымі мэтамі. Беларуская справа быццам ставіцца ў Нямеччыне нараўне з украінскай, відаць, на выпадак падзелу Расеі на паасобныя нацыянальныя дзяржавы.

ІТАЛЬЯНСКА-ФРАНЦУСКІ КАНФЛІКТ.

У сьнежні зьвярнуў на сябе ўвагу італ.-францускі канфлікт. Пачаўся ён раптам і няспадзявана. Месяц таму назад на паседжаньні італьянскага парлямэнту, пасьля прамовы мін. Чіано, у каторай было сказана, што ў грозныя верасьнёвыя дні 500-тысячная італ. армія сканцэнтравалася на францускай граніцы, раптам пачаліся масавыя выкрыкі фаш. паслоў пад адрасам Францыі: „жадаем звароту Корсыкі і Тунісу“. Дзеля таго што ў італ. парлямэнце сядзяць толькі здысцыплінаваныя фашысты, прысутныя адразу здагадаліся, што ў штабе Муссоліняга апрацаваны нейкі новы плян дзеяньня. Толькі ня ведалі, які гэта плян і не маглі зразумець, чаму італьянцы жадаюць Корсыкі, якой Францыя без вайны не аддасьць? Але скора справа выясьнілася. Аказалася, што Італія жадае ня так Корсыкі, як францускай калёніі каля Абісыніі з портам Джыбутті, правоў у Суэскім канале і ў Тунісе. На гэтыя жаданьні Францыя грозна адказала, што не ўступіць нічога. Нават прэм'ер Далядье дэмонстрацыйна выбраўся ехаць у Туніс разам з цэлай эскадрай; Але кажуць, што дзе як дзе, але ў Джыбутті і ў Суэскім канале Францыя трохі ўступіць і да вайны ня дойдзе. Франц. прэса піша, што ў дамаганьнях Італіі дапаможа Нямеччына, якая ў даўгу перад Італіяй за Аўстрыю і Судэты. Інакш кажучы, памагла Італія Нямеччыне здабыць Аўстрыю і Судэты, дык цяпер чарга за Нямеччынай памагчы здабыць і Італіі нешта...

Рэдактар-выдавец:
мгр. В. Гадлеўскі.

Redaktor-wydawca: mgr. W. GODLEWSKI.

Druk. M. Bogatkiewicza i B. Trućko. Wilno, ul. Ad. Mickiewicza 22-a, m. 30.

BIBLJOTEKA w Wilnie im. Wróblewskich